# Календарно-тематическое планирование

## Беларуская літаратура. 5 клас

(колькасць гадзін на год — 70, на тыдзень — 2)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу праводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай падручніка: Цітова, Л. К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / Л. К. Цітова. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

| Нумар урока і дата правядзення | Тэма ўрока | Колькасць гадзін | Мэты вывучэння тэмы | Характарыстыка асноўных відаў і спосабаў дзейнасці | Дамашняе заданне |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **Уводзіны** Падарожжа па Краіне літаратуры. Тэматычная, змястоўная разнастайнасць фальклорных і літаратурных твораў. Пазнавальнае, выхаваўчае і эстэтычнае значэнне мастацкай літаратуры | 1 | Узнавіць і паглыбіць набытыя вучнямі ў пачатковай школе эмпірычныя веды пра літаратуру як мастацтва слова, яе пазнавальнае, выхаваўчае і эстэтычнае значэнне. Акрэсліць (на прыкладзе вядомых твораў) тэматычную і жанравую разнастайнасць літаратуры. Прыгадаць і абмеркаваць народныя выслоўі, выказванні беларускіх пісьменнікаў пра ролю асветы і кнігі ў жыцці чалавека. Пазнаёміць са структурай, зместам, мастацкім афармленнем, прызначэннем вучэбнага дапаможніка | Чытанне ўступнага артыкула вучэбнага дапаможніка «Дарагія сябры» і яго абмеркаванне. Вуснае выказванне з элементамі разважання: «Чаму мастацкую літаратуру называюць чалавеказнаўствам?». Выразнае чытанне народных выслоўяў пра ролю асветы і кнігі ў жыцці чалавека, аналіз іх зместу («Век жыві, век вучыся», «У каго веды, у таго і сіла», «За аднаго вучонага дзесяць невукаў даюць», «Навука вочы адкрывае», «Кніга — маленькае акенца, а праз яго ўвесь свет відаць» і інш.). Вусная замалёўка паводле адной з прыказак | Перачытаць уступны артыкул. Паразважаць над зместам народных выслоўяў: «Вучэнне — свет», «Ад навукі спрытнеюць розум і рукі», «На працягу ўсяго века кніга вучыць чалавека». Падрыхтаваць вуснае сачыненне-мініяцюру паводле адной з прыказак (на выбар) |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| **І. Роднае слова (4 гадзіны)**<br>**Раздзел падручніка «Мой чароўны беларускі край…»** | | | | | |
| 2 | Пятрусь Броўка. «Калі ласка» | 1 | Выявіць шматграннасць чалавечых пачуццяў і думак, выказаных у вершы: захапленне маладычнасцю, трапнасцю, выразнасцю роднай мовы; гонар паэта за высокія маральныя якасці беларускага нацыянальнага характару — гасціннасць, ветлівасць, добразычлівасць, прыязнасць, шчодрасць, спагадлівасць, жыццёвы аптымізм і інш. Вучыць пяцікласнікаў выразна чытаць і аналізаваць лірычныя творы (адчуваць агульны настрой, разумець аўтарскія перажыванні, спасцігаць паэтычныя вобразы і сродкі іх стварэння, выдзяляць голасам лагічныя націскі і паўзы, заўважаць адметнасці рытму, мелодыку верша, перадаваць праз уласнае чытанне пачуцці аўтара і сваё асабістае стаўленне да верша) | Выразнае чытанне верша, аналіз яго зместу (спасціжэнне агульнага настрою, выказаных пачуццяў і перажыванняў, паэтычных вобразаў і сродкаў іх стварэння). Вуснае выказванне пра беларускі нацыянальны характар (з апорай на змест верша і ўласнае ўяўленне) | Перачытаць верш Петруся Броўкі «Калі ласка» і паразважаць над яго зместам. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку[1] |

[1] Тут і далей пры вызначэнні дамашняга задання настаўнік (з улікам канцэпцыі канкрэтнага ўрока) адбірае з метадычнага апарату, змешчанага ў вучэбным дапаможніку да кожнага твора, пэўныя пытанні і заданні і паведамляе іх нумары вучням.

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 3 | Яўгенія Янішчыц. «Мова» | 1 | Засяродзіць увагу вучняў на выяўленні аўтарскай пазіцыі ў вершы Яўгеніі Янішчыц «Мова». Пры магчымасці пазнаёміць пяцікласнікаў з вершам Анатоля Грачанікава «Мова» і прапанаваць ім параўнаць гэтыя творы. Фарміраваць уменні вучняў супастаўляць тэматычна блізкія вершы (па зместу, настраёвасці, аўтарскіх пачуццях, мастацкіх вобразах, будове, інтанацыі і інш.), выказваць уласнае стаўленне да твораў і абгрунтоўваць яго. Удасканальваць маўленчыя ўменні пяцікласнікаў | Выразнае чытанне і аналіз верша (абмеркаваць выказаныя думкі і перажыванні, выявіць вобразы і сродкі іх мастацкага выяўлення). Супастаўленне тэматычна блізкіх вершаў розных аўтараў (па зместу, агульным настроі, аўтарскай пазіцыі, вобразах, форме) | Самастойна перачытаць верш Яўгеніі Янішчыц «Мова» і паразважаць над ім, карыстаючыся пытаннямі вучэбнага дапаможніка. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша. Скласці вуснае выказванне на тэму: «Чым з'яўляецца мова для народа?» (з апорай на вядомыя творы) |
| 4 | Уладзімір Караткевіч. «Бацькаўшчына» | 1 | Развіваць вобразнае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні мастацкіх карцін прыроды ў паэтычным творы, выхоўваць уважлівае стаўленне да аўтарскага слова. Удасканальваць уменні школьнікаў узнаўляць карціны і вобразы, створаныя паэтам, вызначаць настрой і танальнасць, выяўляць аўтарскія пачуцці і перажыванні, перададзеныя праз адметную форму, арыгінальныя вобразы, мастацкія тропы, мелодыку верша. Пазнаёміць з рэпрадукцыямі мастацкіх палотнаў Вітольда Бялыніцкага-Бірулі | Выразнае чытанне верша. Асэнсаванне аўтарскай пазіцыі, апісанне ўласнага ўражання ад твора. Аналіз зместу, вобразаў, формы верша. Разгляд рэпрадукцый карцін (звярнуць увагу на іх змест, агульны настрой, вобразы, фарбы, дэталі, кампазіцыю). Супастаўленне верша з творамі жывапісу Вітольда Бялыніцкага-Бірулі і Эдуарда Рымаровіча (тэматыка, настраёвасць, вобразы і дэталі, эмацыянальнае гучанне, аўтарская пазіцыя, будова) | Самастойна перачытаць верш Уладзімера Караткевіча «Бацькаўшчына», адказаць на пытанні да твора, навучыцца яго выразна чытаць. Падрыхтаваць вуснае сачыненне з элементамі апісання «Прырода на палотнах мастакоў Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зацвіла калужніца», |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | «Зацвіла калужніца» і Эдуарда Рымаровіча «Свежая раніца», вучыць пяцікласнікаў успрымаць пейзаж, створаны мастаком, параўноўваць настраёвасць і вобразны лад літаратурнага тэксту і твора жывапісу | | Эдуарда Рымаровіча «Свежая раніца » і ў вершы паэта Уладзімера Караткевіча» |
| 5 | Анатоль Грачанікаў. «Дрымотна ціснуцца кусты...» або Яўген Крупенька. «Ёсць у кожнага з нас...» | 1 | Пазнаёміць пяцікласнікаў з выдатным узорам грамадзянскай лірыкі. Дапамагчы вучням зразумець аўтарскія думкі і пачуцці, іх суаднесенасць з апісаннямі карцін прыроды, ацаніць дасканаласць і арыгінальнасць мастацкіх вобразаў, багацце сродкаў мастацкага выяўлення, пафас верша. Вучыць аналізаваць пейзажныя творы жывапісу, супастаўляць іх з мастацкімі апісаннямі прыроды ў літаратурным творы. Фарміраваць эмпірычнае ўяўленне пяцікласнікаў пра мастацкі вобраз у лірычным творы (без знаёмства з дэфініцыяй паняцця) | Выразнае чытанне верша, аналіз выказаных паэтам думак і пачуццяў, спасціжэнне настраёвасці, вобразнага ладу, інтанацыі, формы твора. Супастаўленне яго з вершам Уладзіміра Караткевіча «Бацькаўшчына», блізкім па тэме, патрыятычным пафасе. Разгляд фрагменту рэпрадукцыі карціны Уладзімера Хадаровіча «Сакавік» (агульны настрой, кампазіцыя, выразныя дэталі, фарбы) | Перачытаць верш Анатоля Грачанікава «Дрымотна ціснуцца кусты...» або Яўгена Крупенькі «Ёсць у кожнага з нас...» і паразважаць над тэкстам, карыстаючыся пытаннямі да твора. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша, вусную замалёўку з элементамі разважання: «Ці ёсць што агульнае ва ўспрыманні роднай зямлі мастаком і паэтам?» |
| 6 | Урок развіцця маўлення Вуснае выказванне на адну з тэм: | 1 | Абудзіць патрыятычныя пачуцці вучняў (любоў да сваёй зямлі, захапленне яе прыродай, гонар за слаўную гісторыю, багатую культуру, векавыя традыцыі нашага народа). | Паўтарэнне матэрыялу першага раздзела вучэбнага дапаможніка і абагульненне ведаў, атрыманых пры вывучэнні вершаў, асэнсаванне асабістых уражанняў ад успрымання | Падрыхтаваць да выставы ў класе «Мой чароўны беларускі край...» рэпрадукцыі карцін айчынных мастакоў, |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | «Мой родны кут, як ты мне мілы!», «Бацькаўшчына светлая мая...», «Наша мова — цудоўная, спеўная...» | | Абагульніць і сістэматызаваць веды і ўменні, набытыя пяцікласнікамі пры вывучэнні раздзела падручніка «Мой чароўны беларускі край...». Навучыць пяцікласнікаў рыхтаваць вуснае выказванне | твораў літаратуры і жывапісу. Стварэнне калектыўнага вуснага выказвання па абранай тэме. Абмеркаванне атрыманых вынікаў творчай працы на ўроку | пейзажы з фотаальбомаў, уласныя малюнкі або фатаграфіі дарагіх сэрцу беларускіх краявідаў |
| **II. Вусная народная творчасць (13 гадзін)<br>Раздзел падручніка «За смугою стагоддзяў»** | | | | | |
| 7 | Беларускія народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці | 1 | Узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць эмпірычныя веды вучняў, набытыя ў пачатковай школе, пра вусную народную творчасць і пра фальклорныя казкі ў прыватнасці. Пазнаёміць пяцікласнікаў з відамі народных казак (бытавымі, чарадзейнымі, казкамі пра жывёл), іх адметнасцямі і жанравымі ўласцівасцямі.<br>Адзначыць традыцыйную будову народных казак, наяўнасць асноўнага канфлікту, падзел герояў на станоўчых і адмоўных, своеасаблівую мову.<br>Садзейнічаць спасціжэнню вучнямі выхаваўчай скіраванасці фальклорных казак | Адрозніваць тэксты народных казак, вызначаць іх від (чарадзейныя, бытавыя, казкі пра жывёл). Выразна чытаць і пераказваць народныя казкі, разумець сутнасць канфлікту, вусна характарызаваць персанажаў, даваць ацэнку іх паводзінам і учынкам, адрозніваць казачную лексіку, аналізаваць будову | Прачытаць артыкулы вучэбнага дапаможніка «Вусная народная творчасць» і «Народныя казкі, паразважаць над пытаннямі да артыкула «Народныя казкі». Прыгадаць любімыя казкі, падрыхтаваць пераказ адной з іх (на выбар), абгрунтаваць яе прыналежнасць да пэўнага віду народных казак |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Бытавая казка «Разумная дачка» | 2 | Пазнаёміць вучняў з народнай бытавой казкай «Разумная дачка». Прааналізаваць паводзіны казачных персанажаў паводле выяўлення чалавечых каштоўнасцей (кемлівасці, знаходлівасці, працавітасці, смеласці, настойлівасці ў дасягненні мэты і пераадоленні жыццёвых нягод і выпрабаванняў). Вучыць характарызаваць персанажаў паводле іх учынкаў і паводзін | Выразнае чытанне бытавой казкі. Дэталёвы разгляд эпізодаў твора (выпадковае з'яўленне цялушачкі ў беднай сялянскай сям'і, панскі суд, адгадванне загадак багацеем і сялянскай дзяўчынкай, сустрэча пана з бедняковай дачкой, новыя панскія заданні дзяўчынцы-самігодцы, разумная дачка судзіць сялян, уцёкі пана з сялянскай хаты бедняка). Вусная характарыстыка герояў казкі | Перачытаць казку, адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Супаставіць паводзіны герояў казкі (пана, багацея і яго жонкі, бедняка, дзяўчынкі-самігодкі) у розных жыццёвых сітуацыях |
| 9 | | | Выпрацоўваць навыкі выразнага чытання казак, пабудаваных на дыялогах (звярнуць ўвагу на індывідуалізацыю мовы герояў, стоены гумар і сродкі яго выяўлення ў бытавой казцы). Вучыць інсцэніраваць фрагмент казкі, аналізуючы манеру герояў гаварыць і трымаць сябе, прадумваючы інтанацыю, жэсты, міміку выканаўцаў | Выразнае чытанне казкі па асобах. Аналіз эпізодаў, у якіх раскрываюцца характары казачных герояў. Калектыўная падрыхтоўка інсцэніровкі аднаго з эпізодаў казкі | Падрыхтаваць выразнае чытанне казкі «Разумная дачка» (асаблівую ўвагу звярнуць на дыялогі, умець прачытаць казку па ролях) |
| 10 | Чарадзейная казка «Залаты птах» | 2 | Пашырыць уяўленне вучняў пра чарадзейныя казкі, іх жанравыя ўласцівасці (асноўны канфлікт, наяўнасць чарадзейных элементаў, выразнае размежаванне герояў на станоўчых і адмоўных, сцвярджэнне | Чытанне казкі «Залаты птах». Калектыўнае абмеркаванне асноўнай тэмы і галоўнай думкі твора. Вызначэнне межаў асобных эпізодаў казкі. Складанне падрабязнага | Перачытаць казку «Залаты птах», адказаць на пытанні да твора. Падрыхтаваць падрабязны пераказ аднаго з яе |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | дабрыні і спагадлівасці, працавітасці і сумленнасці, адданасці і вернасці ў сяброўстве і інш.). Раскрыць сутнасць асоўнага канфлікту казкі «Залаты птах» | плану для пераказу твора. Выразнае чытанне фрагментаў казкі па асобах | эпізодаў (настаўнік вызначае асобны эпізод для пэўнай групы пяцікласнікаў ці размяркоўвае заданні па варыянтах). Намаляваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў казкі (на выбар) |
| 11 | | | Ахарактарызаваць пазіцыю кожнага з персанажаў. Развіваць уменні вучняў разумець сутнасць канфлікту, расстаноўку герояў у чарадзейных казках, заўважаць адметнасці лексікі, перадаваць напружанасць дзеяння пры чытанні, узнаўляць паслядоўнасць падзей пры вусным пераказе, выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў, аналізаваць будову казкі і выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй. Звярнуць увагу на адсутнасць у народных казках мастацкіх апісанняў, псіхалагічных характарыстык герояў, на зададзенасць і статычнасць характараў. Сфарміраваць уяўленне пра мастацкую гіпербалу і яе ролю ў творы | Пераказ асноўных эпізодаў казкі, у якіх надзвычай ярка раскрываюцца характары. Калектыўная ацэнка паводзін герояў. Вусная характарыстыка персанажаў казкі — гаспадара, яго сыноў Сцяпана, Піліпа і Івана, ваўчыхі, караля, кухара. Калектыўнае абмеркаванне плана казкі | Падрыхтаваць сціслы пераказ казкі «Залаты птах» па складзеным на ўроку плане, захоўваючы адметнасці казачнага аповеду. Падрыхтаваць вусную характарыстыку аднаго з персанажаў казкі (на выбар) |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 12 | Народная казка «Музыкі» | 1 | Прааналізаваць паводзіны персанажаў казкі пра жывёл «Музыкі». Абагульніць веды вучняў пра народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці (сюжэт, канфлікт, характары, будову, спецыфічную лексіку) | Выразнае чытанне казкі, вольны пераказ яе зместу. Вусная ацэнка падзей і паводзін кожнага з персанажаў. Абмеркаванне асобных эпізодаў, якія найлепш падыходзяць да ілюстравання | Перачытаць беларускую народную казку «Музыкі», адказаць на пытанні да твора, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Падрыхтаваць выразнае чытанне казкі. Намаляваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў казкі (на выбар) |
| 13 | **Урок дадатковага чытання** Народная казка (на выбар настаўніка) | 1 | Чытанне народнай казкі, прапанаванай праграмай для дадатковага чытання. Аналіз будовы, сюжэту, вобразаў, павучальнага зместу казкі | Вызначэнне тэматычнай дамінанты казкі, аналіз асноўнага канфлікту, характараў герояў, адметнасцей будовы і мовы казкі (своеасаблівыя зачын і канцоўка, трохразовыя паўторы, перавелічэнні, багацце трапных выслоўяў, адсутнасць канкрэтных апісанняў і псіхалагічнай матывіроўкі паводзін герояў) | Падрыхтаваць у класе калектыўную кніжную выставу любімых казак з ілюстрацыямі прафесійных мастакоў і сваімі ўласнымі малюнкамі |
| 14 | Фальклорныя легенды. «Нарач» | 1 | Даць вучням агульнае ўяўленне пра легенду як фальклорны жанр (у пераважнай большасці твораў — наяўнасць элементаў фантастыкі: неверагодныя здарэнні, незвычайныя героі, дзівосныя прыгоды і інш.). | Выразнае чытанне твора. Веданне асноўных жанравых прыкмет фальклорнай легенды (паэтызацыя гістарычных падзей, услаўленне народных герояў пры лаканічнай абмалёўцы іх знешнасці, наяўнасць | Прачытаць тэарэтычны артыкул «Легенды». Падрыхтаваць выразнае чытанне легенды «Нарач» (асаблівую |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Пазнаёміць са зместам легенды «Нарач», звярнуць увагу на выяўленне душэўнай чысціні і прыгажосці герояў твора Найрыты і Андрэя, на іх вернасць ў каханні, маральную перавагу над панам. Прааналізаваць апісанне чароўнага возера. Удасканальваць уменне вучняў расказваць легенды, карыстаючыся адпаведнай лексікай, захоўваючы эмацыянальнае гучанне, напеўнасць і нетаропкасць (павольнасць) аповеду | у якасці апавядальніка сведкі або непасрэднага ўдзельніка падзеі). Уменне вучняў расказваць легенды з захаваннем іх мастацкіх адметнасцей | ўвагу надаць дыялогам). Стварыць вусную замалёўку пра галоўную гераіню твора Найрыту (апісаць яе знешні выгляд, узаемаадносіны з каханым Андрэем, аднавяскоўцамі, панам, пракаменціраваць яе жыццёвы выбар) |
| 15 | Народная легенда «Пестунь» | 1 | Засяродзіць увагу вучняў на мастацкай выразнасці легенды, багацці бытавых і сацыяльных рэалій, спосабах абмалёўкі вобразаў, даступнасці зместу і лаканізме формы. Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць характары персанажаў, іх месца і ролю ў казачным сюжэце, зразумець павучальны змест твора | Выразнае чытанне легенды «Пестунь». Апісанне і ацэнка паводзін людзей і ваўкоў, маральная выснова з гэтага жыццёвага здарэння | Падрыхтаваць вольны пераказ легенды «Пестунь» (як запомнілася). Прыгадаць іншыя беларускія легенды, прачытаныя самастойна, каб расказаць іх на ўроку |
| 16 | Загадкі | 2 | Аднавіць, сістэматызаваць і паглыбіць эмпірычныя веды вучняў пра загадкі. Расказаць пра ўзнікненне загадак, іх першапачатковае прызначэнне, прынцыпы стварэння. Паказаць на канкрэтных прыкладах мастацкія адметнасці і ўласцівасці загадак (дасціпнасць, | Адгадваць загадкі, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Ведаць на памяць некалькі загадак, умець іх загадваць. Разумець прызначэнне загадак і прынцыпы іх стварэння (на аснове параўнання, супастаўлення ў нечым падобных з'яў | Прачытаць тэарэтычны артыкул «Загадкі». Перачытаць загадкі, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Адабраць і пастарацца запомніць па некалькі |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | мудрасць, іншасказальнасць, лаканізм, дасканаласць формы, гумар). Развіваць у вучняў назіральнасць, увагу, кемлівасць, гумарыстычнае стаўленне да паасобных жыццёвых з'яў і чалавечых недахопаў | і прадметаў, калі вядомая рэч паўстае ў нечаканым, незвычайным вобразе), ведаць пра старажытнае паходжанне загадак і іх сучаснае бытаванне. Імкнуцца заўважаць адметнасці, выразныя дэталі асобных прадметаў, з'яў прыроды, уласцівасці характараў людзей | старажытных і сучасных загадак, якія найбольш спадабаліся |
| 17 | | | Удасканальваць уменні вучняў асэнсоўваць, выразна чытаць (загадваць) загадкі і адгадваць іх, звяртаючы ўвагу на арыгінальнасць формы, адметную будову, вобразны лад (у загадках часта рэчы неадушаўлёныя надзелены якасцямі жывых істот). Даць уяўленне пра сучасныя літаратурныя загадкі, вучыць пяцікласнікаў ствараць уласныя загадкі | Вывучыць некалькі новых загадак. Умець загадваць і адгадваць загадкі. Адрозніваць народныя загадкі і загадкі літаратурныя. Паспрабаваць стварыць уласныя загадкі, ведаючы, што яны ўтвараюцца на аснове параўнання ў нечым падобных паміж сабой прадметаў і з'яў, і трэба здагадацца пра сутнасць утоенага і супаставіць яго з тым, што названа ў загадцы | Самастойна адшукаць у бібліятэцы (ці ва ўласных чытанках) некалькі новых загадак, каб загадаць іх на ўроку. Паспрабаваць скласці адну-дзве ўласныя загадкі (ці загадкі-задачы). Паразважаць, для чаго чалавеку варта ведаць як мага больш загадак і ўмець іх адгадваць |
| 18 | Прыказкі | 2 | Пазнаёміць пяцікласнікаў са змешчанымі ў вучэбным дапаможніку прыказкамі Аднавіць, паглыбіць і сістэматызаваць папярэдне набытыя вучнямі эмпірычныя веды пра народныя прыказкі, даць уяўленне | Выразна чытаць і запамінаць прыказкі. Разумець сутнасць прыказак (трапнасць выказвання, звычайна павучальны змест, вобразная ацэнка чалавечых паводзін, учынкаў, | Прачытаць тэарэтычны артыкул «Прыказкі», тэксты саміх прыказак. Запомніць некалькі прыказак (на выбар), |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | пра іх паходжанне і жанравыя асаблівасці (сцісласць, выразнасць, вобразнасць, трапнасць, афарыстычнасць, пераносны сэнс, павучальны змест, мастацкую дасканаласць, тэматычную разнастайнасць) | якасцей), іх прызначэнне. Паразважаць, у якой жыццёвай сітуацыі прыдалася б прыказка «Кароткая пацеха, а доўгае пакаянне» (ці якая іншая — на выбар настаўніка) | падрыхтаваць паводле адной з іх вусную замалёўку |
| 19 | | | Дапамагчы вучням усвядоміць, што прыказкі — своеасаблівая энцыклапедыя народнага жыцця на працягу шматвекавой гісторыі. Навучыць выразна чытаць і асэнсоўваць прыказкі, разумець іх падтэкст, вызначаць тэматычную дамінанту, ствараць уласныя замалёўкі паводле прапанаванай прыказкі | Веданне некалькіх прыказак на памяць, разуменне іх павучальнага сэнсу і падтэксту, уменне прымяняць выслоўі на практыцы. Вуснае сачыненне-мініяцюра паводле адной з прыказак | Перачытаць прыказкі, згрупаваць іх па прапанаваных у вучэбным дапаможніку тэмах, запомніць як мага больш выслоўяў, каб пры нагодзе актыўна карыстацца імі ў сваім маўленні |
| 20 | Прыкметы і павер'і | 1 | Абагульніць і паглыбіць веды вучняў пра народныя прыкметы і павер'і, іх узнікненне, прызначэнне, асноўныя функцыі (дарадчую, перасцерагальную, забарончую). Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць афарыстычнасць і трапнасць народных выслоўяў, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека. Паказаць блізкасць прыкмет і павер'яў да загадак і прыказак | Веданне некалькіх прыкмет і павер'яў на памяць. Разуменне сутнасці прыкмет (прадказваюць пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам) і павер'яў (вытлумачваюць пэўны факт, грунтуючыся на выдумцы, фантазіі, прымхах). Уменне адрозніваць прыкметы і павер'і ад прыказак | Засвоіць змест тэарэтычнага артыкула «Прыкметы і павер'і», перачытаць тэксты выслоўяў, запомніць некалькі з іх, што прадказваюць пэўнае надвор'е. Падрыхтаваць вусную замалёўку паводле адной з прыкмет: «Май лясы прыбірае, |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лета ў госці чакае», «Калі не будзе зімой бела, не будзе ўлетку зелена», «Грымоты ў верасні — на цёплую восень» (на выбар) |
| 21 | **Урок развіцця маўлення** Абагульняльны ўрок-конкурс па раздзеле «За смугою стагоддзяў» | 1 | Замацаваць і прывесці ў сістэму набытыя пяцікласнікамі веды пра фальклор і яго жанры. Прыўнесці ў навучальны працэс элементы займальнасці, творчасці, спаборніцтва (прапанаваць вучням расказаць уласную казку на аснове фальклорных сюжэтаў і вобразаў, пераказаць народную казку ці легенду, загадаць некалькі загадак, скласці вусную замалёўку па абранай прыказцы, падрыхтаваць інсцэніроўку асобнага эпізоду казкі: вызначыць асобныя дыялогі і скампанаваць іх, каб атрымалася кароценькая пастаноўка, вызначыць мізансцэны, прадумаць манеру ўдзельнікаў трымацца і гаварыць, можна нават падрыхтаваць дэкарацыі, падабраць музычнае афармленне, зрабіць афішу) | Трывалае веданне сутнасці фальклорных жанраў — казак, легенд, загадак, прыказак, прыкмет. Расказванне цікавай легенды, стварэнне ўласнай казкі (з апорай на фальклорныя сюжэты і вобразы), загадванне і адгадванне загадак, складанне вуснай замалёўкі па абранай прыказцы, інсцэніраванне асобнага эпізоду казкі | Адказаць на пытанні і выканаць заданні да ўсяго раздзела, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Наладзіць у класе выставу ілюстраваных фальклорных зборнікаў, а таксама вучнёўскіх ілюстрацый да твораў |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| **III. Літаратурныя казкі і легенды (10 гадзін)**<br>**Раздзел падручніка «Казка — у жыцці падказка»** | | | | | |
| 22 | Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы «Нарач») | 1 | Дапамагчы вучням асэнсаваць змест паэтычнага ўвасаблення народнай легенды пра ўзнікненне возера Нарач, спасцігнуць вобразны лад мастацкага твора, яго сюжэт, будову, багацце моўных выяўленчых сродкаў, блізкіх да фальклорных. Паглыбіць веды вучняў пра жанравыя адметнасці літаратурнай легенды, яе адрозненне ад легенды фальклорнай | Выразнае чытанне твора, разуменне сутнасці канфлікту, жанравай спецыфікі літаратурнай легенды. Пераказаць, як, паводле легенды, узнікла возера Нарач. Падзяліць тэкст на лагічна завершаныя часткі, падабраць да іх загалоўкі. Даць вусную ацэнку падзеям, ахарактарызаваць герояў твора | Прачытаць тэарэтычны артыкул «Вусная народная творчасць і мастацкая літаратура». Падрыхтаваць выразнае чытанне твора, скласці вусны аповед пра Галіну. Вызначыць чарадзейныя элементы ў сюжэце легенды. Намаляваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў. Узнавіць у памяці тэкст фальклорнай легенды «Нарач» |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 23 | Легенды «Нарач» і «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы Максіма Танка «Нарач»). Параўнальны аналіз фальклорнага і літаратурнага твораў | 1 | Параўнаць сюжэты народнай і літаратурнай легенд, характары галоўных герояў і спосабы іх паказу ў творах (апісанні прыроды, абмалёўка знешняга выгляду герояў, іх душэўнага стану, псіхалагічная матывіроўка паводзін, адносіны аўтара-апавядальніка і інш.). Прааналізаваць спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі ў літаратурнай легендзе Максіма Танка | Разуменне спецыфікі літаратурнай легенды і легенды народнай.<br>Параўнальны аналіз сюжэтаў, падзей, паводзін герояў і спосабаў іх абмалёўкі, апісанняў прыроды, аўтарскай пазіцыі, мовы. Кароткае вуснае развažанне, што яднае літаратурную і фальклорную легенды, чым яны адрозніваюцца. | Самастойна прачытаць беларускую народную або літаратурную легенду (пра падзею нацыянальнай гісторыі, утварэнне ракі, возера, горада ці паселішча) і ўмець расказаць яе на ўроку |
| 24 | Якуб Колас. «Крыніца» | 2 | Пазнаёміць вучняў з алегарычна-філасофскім зместам літаратурнай казкі, разгледзець маральна-этычныя праблемы твора. Удасканальваць аналітычныя ўменні пяцікласнікаў пры разглядзе празаічнага твора, скіраваць увагу на характары маці-гары і дачушкі-крынічкі і спосабы іх раскрыцця (аўтарскі погляд на падзеі жыцця і на саміх герояў, апісанні знешняга выгляду персанажаў, іх паводзін і перакананняў, клопатаў і перажыванняў) | Разуменне (на элементарным эмпірычным узроўні) спецыфікі літаратурнай філасофскай казкі. Выразнае чытанне твора, вылучэнне эпізодаў, важных для характарыстыкі персанажаў. Вусная ацэнка паводзін маці-гары і дачушкі-крынічкі | Падрыхтаваць выразнае чытанне казкі Якуба Коласа «Крыніца», адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Выказаць сваё стаўленне да вобразаў маці-гары і дачушкі-крынічкі |
| 25 | | | Дапамагчы вучням спасцігнуць галоўную думку казкі, яе філасофскі падтэкст, алегарычны сэнс. Звярнуць увагу пяцікласнікаў на спалучэнне казачнага і рэальнага ў творы, на жанравыя адметнасці | Веданне зместу казкі, цытаванне радкоў, у якіх сфармулявана галоўная думка казкі. Спасціжэнне (на элементарным узроўні) мастацкай ідэі казкі, яе філасофскага падтэксту. | Падрыхтаваць падрабязны пераказ казкі, карыстаючыся планам. Праілюстраваць адзін з эпізодаў твора |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | літаратурнай казкі. Вучыць спасцігаць функцыянальную ролю апісанняў карцін прыроды ў мастацкім творы | Падзел твора на сэнсавыя часткі, падбор да іх назваў. Пераказ казкі (з захаваннем адпаведнай казачнай лексікі) па калектыўна складзеным плане | (на выбар) і даць каментарый да ўласнай ілюстрацыі. Скласці вусную замалёўку-параду: «Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі» |
| 26 | Уладзімір Караткевіч. «Нямоглы бацька» | 2 | Удасканальваць уменні пяцікласнікаў цэласна ўспрымаць сюжэт літаратурнай казкі, вызначаць паслядоўнасць падзей, выяўляць ключавыя эпізоды, важныя для спасціжэння мастацкай ідэі твора і для характарыстыкі герояў; развіваць уменне суадносіць учынкі герояў і матывы іх паводзін, разумець ролю партрэта героя ў празаічным творы | Ахарактарызаваць час дзеяння ў творы, пракаменціраваць закон, якога трымаліся дзікія людзі, прыгадаць выпрабаванні, што выпалі на іх долю. Раскрыць сэнс назвы твора. Даць сучасную маральную ацэнку паводзінам Пятра і Гната | Падрыхтаваць выразнае чытанне казкі Уладзіміра Караткевіча «Нямоглы бацька», адказы на пытанні да твора. Скласці вуснае паведамленне пра старога бацьку |
| 27 | | | Спрыяць спасціжэнню вучнямі мастацкай ідэі твора, аўтарскай пазіцыі (без ужывання дэфініцый паняццяў), маральнай высновы казкі Уладзіміра Караткевіча, яе гуманістычнага пафасу. Удасканальваць уменне вучняў характарызаваць герояў паводле іх учынкаў і паводзін | Выразна чытаць твор, скласці план і падрыхтаваць на яго падставе пераказ асобных эпізодаў казкі. Даць вусную характарыстыку Пятру і Гнату. Знайсці ў тэксце выразныя адзнакі ўплыву фальклору (прааналізаваць асноўныя падзеі, канфлікт паміж героямі, сродкі стварэння вобразаў, будову і мову твора) | Падрыхтаваць пераказ ключавых эпізодаў казкі, вусную параўнальную характарыстыку вобразаў Пятра і Гната |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 28 | Георгій Марчук. «Чужое багацце» | 3 | Выявіць непасрэдныя вучнёўскія ўражанні ад прачытанай часткі твора, асноўную ўвагу засяродзіць на аналізе вобразаў-антыподаў (Ганначка, Іванка, Бусел і Жаўрук — пан Майданскі, Кадук, Пачварнік і Русалка) і спосабах іх абмалёўкі ў творы | Чытанне акрэсленай настаўнікам часткі казкі, аналіз расстаноўкі персанажаў у ёй. Выдзяленне эпізодаў, важных для характарыстыкі герояў | Прачытаць акрэсленую настаўнікам частку казкі Георгія Марчука «Чужое багацце», адказаць на пытанні да тэксту. Падрыхтаваць вусную замалёўку пра суполку прадстаўнікоў злых сіл і іх дзеянні (Кадук, Майданскі, Русалка, Пачварнік) |
| 29 | | | Пашырыць уяўленні пяцікласнікаў пра літаратурную казку, яе падабенства да народнай (наяўнасць казачнай калізіі, чарадзейныя і фантастычныя элементы, падзел герояў на станоўчых і адмоўных, сутыкненне дабра і зла з абавязковай перамогай дабра, трохразовыя паўторы, зачын і канцоўка, спецыфічная казачная лексіка і інш.) | Выразнае чытанне казкі. Пераказ найбольш значных эпізодаў твора, аналіз асноўнага канфлікту. Вуснае паведамленне пра Ганначку (хто яна, які запавет атрымала ад маці, якія выпрабаванні выпалі на яе долю і як яна іх пераадольвала). Вытлумачэнне прыказкі «Чужое багацце вочы коле» і яе ўплыву на выбар аўтарам назвы твора | Дачытаць казку Георгія Марчука «Чужое багацце». Расказаць пра змаганне са злом добрых сіл (Ганначка, Іванка, Жаўрук, Бусел). Падрыхтаваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў твора (на выбар) |
| 30 | | | Дапамагчы спасцігнуць сюжэт казкі, яе будову, вобразны лад, багацце сродкаў мастацкага выяўлення, блізкіх да фальклорных (звярнуць увагу вучняў на традыцыйны | Выразнае чытанне фрагментаў тэксту. Аналіз асноўных падзей казачнага сюжэту. Выяўленне агульнага паміж літаратурнай | Вызначыць чарадзейныя элементы ў тэксце. Выказаць і абгрунтаваць свае адносіны да герояў |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | казачны сюжэт — сутыкненне добрых сіл са злымі, на расстаноўку казачных герояў і спосабы іх абмалёўкі, казачную лексіку) | казкай і казкай народнай: тыповы казачны канфлікт — сутыкненне дабра са злом пры абавязковай перамозе дабра, размежаванне персанажаў на станоўчых і адмоўных, традыцыйная будова, наяўнасць адметных зачыну і канцоўкі, паўторы, своеасаблівая лексіка і інш. | казкі, падрыхтаваць вусную замалёўку пра аднаго з персанажаў (на выбар) |
| 31 | Андрэй Федарэнка. «Падслуханая казка» | 1 | Акрэсліць адрозненні літаратурнай казкі ад фальклорнай: ярка выяўленая аўтарская пазіцыя, індывідуалізацыя характарыстык персанажаў, наяўнасць мастацкіх апісанняў (прыроды, часу і месца дзеяння, знешнасці герояў), літаратурная мова, адсутнасць зачыну і канцоўкі і інш. | Выразнае чытанне тэксту, пераказ яго асобных эпізодаў. Аналіз арыгінальнага зместу і адметнай будовы казкі Андрэя Федарэнкі, усведамленне яе арыгінальнасці, адрознення ад іншых літаратурных казак | Падрыхтаваць вусны пераказ «Марыйчын сон», паразважаць, як гэта мастацкае апісанне характарызуе саму гераіню. Скласці вусную замалёўку пра Марыйку |
| 32 | Урок дадатковага чытання | 1 | Разгляд твора, прапанаванага праграмай для дадатковага чытання (на выбар настаўніка ці вучняў) | | |
| **IV. Выразнасць мастацкага слова** (8 гадзін)<br>**Раздзел падручніка «Прыроды вечная краса»** | | | | | |
| 33 | Максім Багдановіч. «Зімой» | 1 | Выклікаць у вучняў пачуццё захаплення прыгажосцю і гармоніяй карцін прыроды, створаных паэтам, дапамагчы адчуць суладнасць прыроды з пачуццямі паэта, са станам яго душы — адчуваннем | Выразнае чытанне верша, аналіз выказаных у ім аўтарскіх пачуццяў і перажыванняў. Спасціжэнне вобразнага і інтанацыйнага ладу верша, багацця і арыгінальнасці моўных | Верш Максіма Багдановіча «Зімой» вывучыць на памяць. Падабраць з фотаальбома зімовы |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | паўнаты і радасці жыцця, бадзёрасцю, усхваляванасцю, захапленнем прыродай, казачнымі краявідамі і зімовым вечарам. Звярнуць увагу пяцікласнікаў на вобразны і інтанацыйны лад верша, пластычнасць і выразнасць мовы, мастацкую дасканаласць формы. Удасканальваць уменне выразна чытаць лірычныя творы | выяўленчых сродкаў, мастацкай дасканаласці формы. Разгляд рэпрадукцыі карціны «Раўбічы» мастака Эдуарда Рымаровіча, аналіз яе сюжэту, вобразаў, фарбаў, агульнага настрою, супастаўленне агульнай настраёвасці гэтага твора жывапісу і верша Максіма Багдановіча | пейзаж, сугучны вобразнаму ладу верша Максіма Багдановіча |
| 34 | Анатоль Грачанікаў. «Зоры спяваюць» | 1 | Дапамагчы вучням адчуць стан душы паэта, яго ўсхваляванасць, душэўную ўзрушанасць, радасць і пяшчоту зачараванне цудоўнымі дзіўнымі спевамі нябесных зор, суладнасцю і гармоніяй гучання нябеснага хору. Выхоўваць эмацыянальную чуйнасць вучняў, развіваць іх вобразнае ўяўленне, здольнасць «бачыць» карціны прыроды, створаныя паэтам, «чуць» чароўныя гукі сусвету. Паглыбіць уяўленне пяцікласнікаў пра мастацкі вобраз і сродкі яго абмалёўкі ў паэтычным творы, пра спосабы выяўлення аўтарскага пачуцця | Выразнае чытанне верша Анатоля Грачанікава «Зоры спяваюць». Спасціжэнне яго арыгінальнага зместу і надзвычай дасканалай формы. Супастаўленне, параўнане вершаў Максіма Багдановіча і Анатоля Грачанікава (агульная настраёвасць, аўтарскія пачуцці, вобразы і карціны прыроды, сродкі моўнай выразнасці, гучанне). Вуснае паведамленне пра свае ўражанні ад ўспрымання гэтых паэтычных шэдэўраў | Падрыхтаваць выразнае чытанне верша Анатоля Грачанікава «Зоры спяваюць». Скласці вусную замалёўку «Зорныя спевы» («Чароўная мелодыя», «Дзіўны хор нябёсаў», «Дзівосныя галасы сусвету» і да т. п.), абапіраючыся на паэтычныя вобразы і ўласныя назіранні |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 35 | Якуб Колас. «Песня лясного жаваранка» (урывак з трылогіі «На ростанях»). Эпітэт у мастацкім творы | 1 | Дапамагчы дзецям «угледзецца» ў апісанне прыроды на досвітку, «услухацца» ў песню лясного жаваранка; развіваць творчае ўяўленне вучняў, вучыць бачыць сувязь апісанняў прыроды з настроем і характарам аўтара, адрозніваць нюансы ў выяўленні пачуццяў. Пашырыць і сістэматызаваць веды пяцікласнікаў пра эпітэт, спрыяць спасціжэнню функцыянальнай ролі эпітэтаў у мастацкім тэксце | Выразнае чытанне твора. Узнаўленне ва ўласным уяўленні апісаных аўтарам карцін прыроды на досвітку — прывольных наднёманскіх лугоў, пышных постацей адзінокіх дрэў над прасторамі зялёнага мора, ускраек лесу, *дзе пачыналіся жоўтыя пяскі*, у вышыні нябёсаў лясного жаваранка, песня якога *даходзіла дасамых глыбінь сэрца і калыхала самыя тонкія струны душы*... Выразнае паўторнае чытанне і аналіз урыўку з апісаннем спеваў лясного жаваранка. Калектыўнае абгрунтаванне думкі, што аўтар твора — не толькі таленавіты слухач, уважлівы, чулы, уражлівы, улюбёны ў жыццё і прыроду, але і надзвычай выдатны майстар слова | Падрыхтаваць выразнае чытанне «Песні лясного жаваранка» Якуба Коласа. Прачытаць артыкул «Пра эпітэт», знайсці ў творы Якуба Коласа эпітэты, якія найбольш уразілі, занатаваць іх у літаратурным сшытку. Падрыхтаваць вуснае сачыненне-апісанне старадрэвіны-хвоі. Па магчымасці вывучыць на памяць хоць некалькі радкоў з надзвычай паэтычнага апісання песні лясного жаваранка |
| 36 | Якуб Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Параўнанне як мастацкі троп | 2 | Засяродзіць увагу вучняў на казачна-адухоўленым свеце прыроды, шматфарбнасці карцін, багацці вобразаў. Развіваць уменні вучняў узнаўляць карціны прыроды, створаныя паэтам з дапамогай вершаванай мовы і мастацкіх тропаў, сачыць за развіццём дзеяння, | Выразнае чытанне часткі твора (да радка ... «Ўжо Костусь двойчы неўзаметкі...»). Узнаўленне ў сваім уяўленні створаных паэтам непаўторных карцін зімовай прыроды. Аналіз мастацкага апісання зухаватага марозу-штукара, | Падрыхтаваць выразнае чытанне часткі твора, адказаць на пытанні вучэбнага дапаможніка. Падрыхтаваць невялікае вуснае сачыненне |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | аналізаваць паводзіны героя, яго эмацыянальны стан, душэўнае ўзрушэнне | непаўторнага ў сваіх праявах. Абмеркаванне душэўнага стану хлопчыка — натуры дзейснай і надзвычай уражлівай | з элементамі апісання «*Мароз над ўсімі маразамі*» |
| 37 | | | Разгледзець твор Якуба Коласа цалкам. Садзейнічаць спасціжэнню вучнямі паўнаты і радасці жыцця, адлюстраваных у тэксце праз яго вобразны і інтанацыйны лад. Прааналізаваць сродкі мастацкага выяўлення ў творы. Удасканальваць навыкі выразнага чытання паэтычных сюжэтных твораў. Узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра параўнанне і яго ролю ў стварэнні мастацкага вобраза. Вучыць пяцікласнікаў складаць цытатны план сюжэтнага вершаванага твора | Выразнае чытанне ўрыўка з апісаннем малюнкаў на вაконных шыбах. Адказы на пастаўленыя настаўнікам пытанні па змесце твора. Вызначэнне ролі моўных выяўленчых сродкаў (у тым ліку і параўнанняў) у стварэнні мастацкіх вобразаў. Вуснае сачыненне-разважанне пра *іншы свет* Костуся, незвычайную ўражлівасць хлопчыка, яго паэтычнае ўспрыманне свету. Калектыўная праца над складаннем цытатнага плана твора | Перачытаць тэарэтычны артыкул «Пра параўнанне». Падрыхтаваць выразнае чытанне ўрыўка з апісаннем зімовага лесу. Адшукаць у тэксце вядомыя пяцікласнікам тропы (эпітэты і параўнанні), пры дапамозе якіх паэт стварыў гэту надзвычай выразную казачную карціну. Падрыхтаваць паводле гэтага апісання вусную замалёўку «Зімовая казка» (можна выбраць іншую назву) |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 38 | Уладзімір Караткевіч. «Лісце» або Анатоль Грачанікаў. «Як ападае ліст...» | 1 | Спрыяць спасціжэнню агульнай танальнасці і настраёвасці верша, дапамагчы заўважыць ледзь улоўныя адценні аўтарскіх пачуццяў, развіваць увагу да слова і вобраза. Выхоўваць у вучняў вобразную чуйнасць, развіваць іх творчае ўспрыманне; дапамагаць у вызначэнні патрэбнай інтанацыі пры чытанні, абапіраючыся на зрокавыя і слыхавыя ўяўленні. Удасканальваць уменне аналізаваць лірычныя творы | Выразнае чытанне і абранага верша Аналіз апісанай карціны прыроды, аўтарскага настрою, сродкаў стварэння паэтычных вобразаў. Пры магчымасці пазнаёміць пяцікласнікаў з другім вершам, сугучным па тэме. Калектыўнае параўнанне тэматычна блізкіх вершаў (звярнуць увагу на танальнасць, аўтарскі настрой, вобразы, форму, мелодыку, моўныя сродкі мастацкай выразнасці і інш.) | Выразнае чытанне верша Уладзіміра Караткевіча «Лісце» (або Анатоля Грачанікава «Як ападае ліст...»). Паразважаць над паэтычнымі вобразамі, створанымі пры дапамозе сродкаў мастацкага выяўлення. Намаляваць ілюстрацыю да аднаго з іх або падабраць рэпрадукцыі карцін, блізкіх па тэме і сугучных па настроі |
| 39 | Анатоль Грачанікаў. «Верасень» | 1 | Выклікаць у вучняў эмацыянальнае ўзрушэнне, дапамагчы адчуць стан душы паэта, засяродзіць увагу на выяўленні лучнасці пачуццяў лірычнага героя (без ужывання дэфініцыі паняцця) са станам прыроды. Звярнуць увагу на паэтычнае адухаўленне прыроды ў вершы, на эмацыянальную пранікнёнасць, цеплыню і задушэўнасць выказвання. Удасканальваць уменне вучняў супастаўляць вершы розных аўтараў, блізкія па тэме, | Выразнае чытанне верша. Аналіз зместу і вобразнай сістэмы твора. Разгляд рэпрадукцыі карціны Уладзіміра Сулкоўскага «Бервянец. Восень». Супастаўленне жывапіснага восеньскага пейзажу з паэтычнай карцінай восені ў вершы Анатоля Грачанікава (настраёвасць, вобразнасць, аўтарскія пачуцці) | Падрыхтаваць выразнае чытанне верша, разгледзець пытанні да твора. Скласці вусную замалёўку на падставе ўласных назіранняў за восеньскай прыродай (з апорай на літаратурнае — паэтычнае або празаічнае — апісанне ці твор жывапісу) |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | але адрозныя па гучанні, настраёвасці, вобразным ладзе. Выпрацоўваць уменні аналізаваць твор жывапісу, параўноўваць яго з літаратурным пейзажным тэкстам (асноўныя вобразы, перадача аўтарскага настрою сродкамі мастацкага выяўлення ў розных відах мастацтва) | | |
| 40 | Пятрусь Броўка. «Кропля» | 1 | Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне вучняў, спрыяць спасціжэнню імі настраёвасці верша Петруся Броўкі «Кропля». Пашырыць эмпірычныя ўяўленні вучняў пра мастацкі вобраз і сродкі яго стварэння ў паэтычным тэксце: тропы, вершаваны памер, рытм, рыфма, гукапіс і інш. | Выразнае чытанне верша. Аналіз твора, вызначэнне мастацкай ролі параўнанняў у стварэнні мастацкага вобраза летняга дажджу. Разважанне над арыгінальнай формай верша (калі вершаваная страфа разбіваецца на кароткія радкі-словы) і яе роляй ў паэтычнай абмалёўцы летняй навальніцы | Падрыхтаваць выразнае чытанне верша Петруся Броўкі «Кропля», адказаць на пытанні да твора. Падрыхтаваць вусную замалёўку (або ілюстрацыю) пра летнюю навальніцу (з апорай на верш Петруся Броўкі і ўласныя назіранні) |
| 41 | **Урок развіцця маўлення** Вуснае сачыненне з элементамі апісання на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з'явамі | 1 | Наладзіць завочную экскурсію ў прыроду (з прыцягненнем рэпрадукцый карцін беларускіх мастакоў, краявідаў з фотаальбомаў). Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне вучняў, вучыць назіраць за прыроднымі з'явамі, заўважаць у прыродзе падрабязнасці і дэталі, маляваць словамі | Самастайнае назіранне за з'явамі прыроды. Разгляд рэпрадукцый пейзажных палотнаў беларускіх мастакоў, краявідаў з фотаальбомаў). Калектыўнае вуснае сачыненне з элементамі апісання карціны прыроды і яго абмеркаванне | Адказаць на пытанні да раздзела вучэбнага дапаможніка «Прыроды вечная краса». Наладзіць выставу рэпрадукцый пейзажных палотнаў беларускіх мастакоў, |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | (з апорай на знаёмыя пейзажныя творы і карціны жывапісу) | | цэласную карціну, перадаваць свае ўласныя ўражанні. Узбагачаць слоўнікавы запас пяцікласнікаў, удасканальваць уменне карыстацца выяўленчымі сродкамі мовы | | пейзажаў з фотаальбомаў (скарыстаць таксама магчымасці мультымедыйных сродкаў), вучнёўскіх малюнкаў і фотаздымкаў |
| **V. Літаратурны твор — складанае і непадзельнае мастацкае адзінства (21 гадзіна)<br>Раздзел падручніка «Сцежкамі дзяцінства»** | | | | | |
| 42 | Якуб Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы «Новая зямля») | 2 | Звярнуць увагу вучняў на рэальна-жыццёвую аснову твора, на паэтычнае асэнсаванне бытавога, паўсядзённага ў жыцці сялянскіх дзяцей; паглыбіць веды пра спосабы паказу характараў герояў (Яські Базылёва, Алеся, Костуся, Міхала); прааналізаваць сродкі стварэння вобразаў дзяцей у творы. Удасканальваць уменне пяцікласнікаў выразна чытаць сюжэтныя паэтычныя тэксты | Выразнае чытанне часткі твора (да апісання звярынца). Калектыўнае абмеркаванне урыўка тэксту з апісаннем восені.<br>Тэкстуальны аналіз эпізоду з'яўлення Яські Базылёва ў сям'і Міхала (знешні выгляд Яські, яго душэўны стан, першыя стасункі з сынамі Міхала, паводзіны ў чужой хаце, незнаёмай сям'і, у нязвыклых для хлопчыка мясцінах і абставінах) | Выразнае чытанне твора і адказ на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Падрыхтаваць вуснае паведамленне (з актыўным цытаваннем тэксту) «Якім уяўляецца мне Яська Базылёў?».<br>Вывучыць на памяць урывак з паэтычным апісаннем восені |
| 43 | | | Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць аўтарскую пазіцыю (цеплыню, сімпатыю, спачуванне, прыхільнасць, лёгкі гумар) у паказе сялянскіх дзяцей. Фарміраваць у вучняў паняцце пра аўтарскі | Абмеркаванне рэпрадукцый карцін Уладзіміра Сулкоўскага «Мікалаеўская камора», «Высокі бераг», «Вапельная гара ў Новым Свержані» з серыі палотнаў «Радзіма | Разгледзець рэпрадукцыі карцін Уладзіміра Сулкоўскага «Мікалаеўская камора», «Высокі бераг», «Вапельная |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | гумар у мастацкім творы і сродкі яго выяўлення.<br>Разгледзець рэпрадукцыі карцін мастака Уладзіміра Сулкоўскага з серыі палотнаў «Радзіма Якуба Коласа».<br>Удасканальваць уменні школьнікаў аналізаваць творы жывапісу, супастаўляць іх з паэтычнымі замалёўкамі | Якуба Коласа». Параўнаць выявы Коласаўскіх мясцін на рэпрадукцыях мастацкіх палотнаў з іх паэтычнымі апісаннямі ў літаратурным творы (пры магчымасці пажадана ў вольны час арганізаваць калектыўную экскурсію па Коласаўскіх мясцінах, каб атрымаць уражанні і веды, неабходныя ў далейшай літаратурнай адукацыі пяцікласнікаў) | гара ў Новым Свержані». Падрыхтаваць вуснае апісанне Коласаўскіх мясцін (на падставе літаратурнага твора, і жывапісных палотнаў, уласных ведаў) |
| 44 | Якуб Колас. «У старых дубах». Тэма і мастацкая ідэя літаратурнага твора | 2 | Удасканальваць уменні вучняў характарызаваць героя па яго учынках, думках, перажываннях, параўноўваць характары і паводзіны герояў (Грышкі і Базыля) у межах аднаго твора, рабіць высновы, абгрунтоўваць свае ацэнкі | Выразнае чытанне апавядання, аналіз адлюстраваных у ім падзей. Калектыўнае абмеркаванне пытання: «На чым грунтавалася сяброўства хлопчыкаў ?».<br>Абмеркаванне рэпрадукцыі карціны Уладзімера Сулкоўскага «Высокі бераг», супастаўленне вобраза Нёмана, створанага мастаком і пісьменнікам | Перачытаць апавяданне Якуба Коласа «У старых дубах», адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку.<br>Прадумаць план і падрыхтаваць па ім сціслы пераказ твора |
| 45 | | | Звярнуць увагу вучняў на драматызм неабачлівых паводзін хлопчыкаў, дапамагчы зразумець, як апісанні прыроды спрыяюць раскрыццю мастацкай ідэі апавядання. | Разгляд пейзажных апісанняў і іх мастацкай ролі ў творы: *цэлы гай старасвецкіх дубоў* на беразе Нёмана, *скошаны луг і паскладаныя курганамі стагі*, чароды буслоў *у неаглядным* | Прачытаць тэарэтычны артыкул «Пра тэму і мастацкую ідэю літаратурнага твора». Паразважаць над пытаннем: |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Паглыбіць веды вучняў пра тэму мастацкага твора, пазнаёміць іх з новым тэарэтычным паняццем — мастацкай ідэяй літаратурнага твора | *прасторы сініх нябёсаў, стары прысадзісты тоўсты дуб* над абрывістым берагам, велічнае сонца над сцішанасцю і спакоем — у прыродзе *ўсё жыло сваім жыццём* (аўтар нездарма двойчы гэта падкрэслівае). Засваенне тэарытычных паняццяў — тэма і мастацкая ідэя літаратурнага твора | «У чым, на вашу думку, прычыны драматычнага здарэння з Базылём?» **Д/з.** Перачытаць артыкул «Пра тэму і ідэю літаратурнага твора», адказаць на пытанні да яго. Выбраць для пастаноўкі ў класе фрагмент (эпізод) абразка (прадумаць мізансцэны, касцюмы герояў, іх інтанацыі, позы, жэсты, міміку і інш.) |
| 46 | Міхась Лынькоў. «Васількі» | 2 | Псіхалагічна падрыхтаваць пяцікласнікаў да ўспрымання твора, дзе гераічнае паўстае разам з трагічным; арганізаваць першаснае ўспрыманне твора (настаўнік абавязкова сам выразна чытае тэкст цалкам). Аналіз пажадана пачаць з кульмінацыі апавядання, пабудаванага спрэс на кантрастных супастаўленнях | Выразнае чытанне апавядання на ўроку, калектыўнае абмеркаванне першаснага ўражання. Аналіз кульмінацыі апавядання — Міколка заўважае на падворку забітых маці і сястрычку | Перачытаць апавяданне Міхася Лынькова «Васількі», адказаць на пытанні да твора. Падрыхтаваць выразнае чытанне эпізоду сустрэчы Міколкі з дзедам Нупрэем |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 47 | | | Працягваць аналіз тэксту твора. Паказаць, як кампазіцыя апавядання ўзмацняе драматызм, напружанасць дзеяння, звярнуць увагу вучняў на ролю апісанні прыроды, мастацкай дэталі ў спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу твора (кантрастныя апісанні грушы на Міколкавым падворку, торбачка з раструшчаным пеналам, васількі ў дарожным пыле) | Аналіз асноўных эпізодаў, у якіх раскрываецца характар Міколкі, адбываецца яго раптоўнае сталенне: з бесклапотнага вясковага хлопчыка ён ператвараецца ў мужнага змагара. Разгляд створаных пісьменнікам карцін прыроды, вызначэнне іх ролі ў абмалёўцы пісьменнікам душэўнага стану Міколкі | Падрыхтаваць вусны аповед пра Міколку — галоўнага героя твора |
| 48 | Рыгор Барадулін. «Бацьку» або Васіль Зуёнак. «Прыйдзі аднойчы...» | 2 | Засяродзіць увагу вучняў на спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу верша Рыгора Барадуліна, на арганічным спалучэнні ў глыбокага лірызму з патрыятычным пафасам (адпаведная лексіка, рытміка, наяўнасць паўз, клічных сказаў, сказаў з простай мовай); акрэсліць пачуцці, перажытыя паэтам ў дзяцінстве і сталым узросце. Разгледзець змест верша Васіля Зуёнка, сродкі перадачы пачуццяў паэта (экспрэсіўнасць выказвання, своеасаблівы рытм, арыгінальная форма верша-звароту, спалучанага з элементамі лірычнай споведзі, шматлікія вобразы-параўнанні, рэфрэн) | Аналіз душэўнага стану героя, думак, пачуццяў і перажыванняў, выказаных у вершы, спосабаў іх выяўлення. Калектыўнае абмеркаванне выбару паэтам своеасаблівага паэтычнага жанру — звароту да бацькі. Вуснае сачыненне-разважанне на тэму: «Чаму, на вашу думку, бацькі лічаць нашчадкаў *сваёй надзеяй і лёсам*? ». Выразнае чытанне верша (прадумаць інтанацыю чытання яго розных сэнсавых частак) | Вывучыць верш Рыгора Барадуліна «Бацьку» на памяць. Падрыхтаваць вусную замалёўку-разважанне пра ролю бацькоў у жыцці чалавека (на падставе ўласных меркаванняў і мастацкіх твораў) |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 49 | | | Пазнаёміць вучняў з жанравымі асаблівасцямі верша-звароту (дакладна названы адрасат, да якога звяртаюцца з эмацыянальнай прамовай). Развіваць уменне пяцікласнікаў параўноўваць вершы, блізкія па жанры і тэматыцы, звяртаючы ўвагу на выказаныя пачуцці, настраёвасць, форму, вобразны лад | Параўнальны аналіз лірычных твораў, блізкіх па тэматыцы і форме. Выпрацоўка ўмення выразна чытаць вершы, тэматычна сугучныя, але адрозныя пафасам, гучаннем, танальнасцю. Веданне жанравых адметнасцяў лірычнай споведзі (наяўнасць сюжэтных элементаў, шчырасць і даверлівасць інтанацыі, непасрэднасць у перадачы пачуццяў, глыбокі лірызм, задушэўнасць) | Прадумаць невялікае вуснае выказванне — зварот да сваіх бацькоў (або да аднаго з іх). Перадаць у сваёй прамове асабістыя думкі, пачуцці, разважанні, успаміны, пажаданні |
| 50 | Анатоль Кудравец. «Цітаўкі». Сюжэт літаратурнага твора | 3 | Пазнаёміць вучняў са зместам апавядання, дапамагчы вызначыць ключавыя эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў | Выразнае чытанне тэксту апавядання, абмеркаванне яго зместу, спосабаў абмалёўкі персанажаў. Вусны аповед пра сяброўства хлопчыкаў | Перачытаць апавяданне Анатоля Кудраўца «Цітаўкі», адказаць на пытанні, змешчаныя да яго ў вучэбным дапаможніку |
| 51 | | | Назапашваць матэрыял, неабходны для характарыстыкі Кастуся і дзеда Агея (звярнуць увагу на адносіны старога вартаўніка да хлапчукоў, на стасункі паміж сябрамі, на спосабы абмалёўкі персанажаў, адносіны аўтара да герояў і інш.) | Узгадаць асноўныя эпізоды апавядання, падсумаваць назіранні вучняў за паводзінамі герояў, звяртаючы ўвагу на раскрыццё душэўнага стану персанажаў. Паразважаць над роляй вобраза дзеда Агея ў маральным станаўленні Кастуся | Паразважаць, ці атрымалі сябры Кастуся Валік і Мішка маральны ўрок пасля здарэння ў калгасным садзе, і абгрунтаваць свае высновы |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 52 | | 1 | Даць уяўленне пра сюжэт літаратурнага твора. Дапамагчы акрэсліць ланцужок падзей, выразна вызначыць межы эпізодаў, асэнсаваць этапы развіцця дзеяння (экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння, кульмінацыі, развязкі) | Складанне падрабязнага плану апавядання (каб больш дакладна акрэсліць паслядоўнасць разгортвання падзей). Калектыўнае абмеркаванне асноўных этапаў сюжэта (экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння, кульмінацыі, развязкі). Вуснае сачыненне пра магчымы далейшы лёс Кастуся | Перачытаць тэарэтычны артыкул «Пра сюжэт літаратурнага твора». Падрыхтаваць вусную характарыстыку Кастуся або дзеда Агея (на выбар) |
| 53 | **Урок дадатковага чытання** | | Разгляд твора, прапанаванага праграмай (на выбар настаўніка) | | |
| 54 | Генрых Далідовіч. «Страта» | 3 | Адзначыць рэальна-жыццёвую аснову твора, пазнаёміць вучняў з яго галоўнымі героямі — Стасем і Міцем Бокуцем. Прааналізаваць першую і другую часткі апавядання, назапашваць матэрыял для аналізу вобраза навічка-пяцікласніка Міці (падрабязнае дэталёвае апісанне яго знешнасці, паводзін на ўроках і дома, размовы бацькоў Стася і вяскоўцаў пра сям'ю Бокуцяў і Міцеву хваробу і інш.) | Чытанне першай і другой частак апавядання, адлюстраваных у іх аналіз падзей. Пераказ асобных эпізодаў, найбольш значных для спасціжэння характараў герояў.<br>Вусны аповед пра Міцю Бокуця (апісанне знешняга выгляду, манеры трымацца, паводзін на ўроках, стасункаў са Стасем і дарослымі) | Перачытаць першую і другую часткі апавядання Генрыха Далідовіча «Страта», падабраць да іх назвы, падрыхтаваць адказы на пытанні, акрэсленыя настаўнікам |
| 55 | | | Засяродзіць увагу вучняў на змесце дзвюх наступных (3—4) частак твора, звярнуць увагу на майстэрскае апісанне душэўнага стану Стася, яго хваляванняў, перажыванняў, пакут (рэўнасці, | Чытанне наступных частак твора, аналіз падзей, што разгорталіся ў іх. Асэнсаванне спосабаў абмалёўкі характараў, выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы. | Дачытаць апавяданне, падабраць назвы да наступных частак твора. Падрыхтаваць вуснае паведамленне пра |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | зайздрасці, першаснай непрыязнасці да Міці, усведамлення сваёй «мізэрнасці» ў параўнанні з навічком); прасачыць за эвалюцыяй узаемаадносін хлопчыкаў. Паглыбіць веды вучняў пра жанр апавядання, тэму і мастацкую ідэю літаратурнага твора | Вусны аповед пра пачатак сяброўства Стася і Міці, мужнасць і настойлівасць Міці ў змаганні з хваробай, адносіны Стася да свайго сябра, асноўныя заняткі і мары хлопчыкаў | сяброўства Стася і Міці |
| 56 | | | Вылучыць эпізоды, важныя для характарыстыкі персанажаў, сачыць за маральным сталеннем Стася, яго высілкамі для самаўдасканаленя. Падвесці вынікі вывучэння твора, высветліць адносіны вучняў да твора і яго герояў | Чытанне заключнай часткі твора, калектыўнае абмеркаванне яго фіналу. Вусная характарыстыка кожнага з хлопчыкаў (паходжанне, знешні выгляд, захапленні, стаўленне да вучобы, погляды на жыццё, стасункі з равеснікамі, бацькамі, настаўнікамі, жыццёвы лёс) | Падрыхтаваць вусную параўнальную характарыстыку-Стася і Міці |
| 57 | Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік» | 3 | Засяродзіць увагу вучняў на змесце раздзелаў: «Што ж за ён быў, той хлопец?», «Легенда пра паходжанне», «Як Брэх стаў Дзікам» — пазнаёміць з героямі твора, прааналізаваць жыццёвы ўклад сям'і Гаспадара, ацаніць паводзіны персанажаў. Даць першаснае ўяўленне пра жанравыя адметнасці аповесці | Самастойнае чытанне твора і абмеркаванне зместу акрэсленых раздзелаў. Вуснае паведамленне пра пачатак сяброўства Дзіка з Гаспадаром | Прачытаць раздзелы: «Што ж за ён быў, той хлопец?», «Легенда пра паходжанне», «Як Брэх стаў Дзікам». Падрыхтаваць вусную замалёўку «Як Дзік апынуўся ў сям'і Гаспадара» |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 58 | | | Прааналізаваць раздзелы «Здарэнне ў завулку», «Сварка з рудым сабачкам», разгледзець стасункі, што склаліся паміж Гаспадаром і Дзікам, прыгадаць, як паводзіў Дзік у розных жыццёвых сітуацыях | Самастойнае чытанне і калектыўнае абмеркаванне апісаных падзей. Вусны аповед пра стасункі Дзіка з дзецьмі і дарослымі | Самастойна прачытаць раздзелы: «Здарэнне ў завулку», «Сварка з рудым сабачкам». Падрыхтаваць падрабязны пераказ аднаго з эпізодаў твора (на выбар) |
| 59 | | | Прааналізаваць раздзелы аповесці: «Дзік і кот Хама», «Дзік адбірае аладку. Дзік гаворыць па тэлефоне», «Развітальнае слова». Высветліць уражанні вучняў, іх стаўленне да герояў і падзей. Засяродзіць увагу на гуманістычным гучанні твора, асобе аўтара-апавядальніка | Вуснае сачыненне пра тое, якую памяць пакінуў пасля сябе Дзік | Прачытаць раздзелы: «Дзік і кот Хама», «Дзік адбірае аладку. Дзік гаворыць па тэлефоне», «Развітальнае слова». Падрыхтаваць вусную замалёўку пра Дзіка (падмацаваць адказ фрагментамі з тэксту), выказаць свае адносіны да героя |
| 60 | Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі». Літаратурны герой у мастацкім творы | 4 | Звярнуць увагу вучняў на рэальна-жыццёвую аснову апавядання, займальнасць сюжэту. Пазнаёміць пяцікласнікаў з падзеямі, адлюстраванымі ў творы, і яго героямі. Увесці вучняў у непаўторны свет прыроды, спрыяць спасціжэнню гуманістычнага пафасу твора | Самастойнае чытанне вызначанай настаўнікам часткі апавядання. Абмеркаванне часу і месца дзеяння, знаёмства з літаратурнымі героямі і падзеямі | Прачытаць вызначаную настаўнікам частку апавядання Уладзіміра Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі», адказаць на пытанні, акрэсленыя настаўнікам. |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Падрыхтаваць разгорнутае паведамленне пра першую сустрэчу Сяргея з Бурыкам |
| 61 | | | Прааналізаваць ключавыя эпізоды твора, засяродзіць увагу вучняў на ўзаемаадносінах Сяргея і Бурыка. Пашырыць уяўленні вучняў пра свет прыроды, яго непаўторнасць, багацце, шматфарбнасць, выхоўваць любоў і беражлівыя адносіны да сваёй зямлі. Развіваць эмацыянальную чуйнасць вучняў, увагу да слова і вобраза. Удасканальваць уменні сачыць за развіццём дзеяння, вызначаць эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў | Выразнае чытанне апавядання, пераказ асобных эпізодаў. Аповед пра любімыя занятк Бурыка ў вялізным доме, яго першыя вандроўкі ў лес, практычныя ўрокі выжывання ў ім | Дачытаць апавяданне, адказаць на пытанні да твора. Падрыхтаваць вусную замалёўку «Сяргей і яго сябар Бурык» |
| 62 | | | Дапамагчы ўсвядоміць значэнне вобраза Бурыка і яго сяброўства з Сяргеем у раскрыцці галоўнай мастацкай ідэі апавядання | Пераказаць блізка да тэксту эпізоды пра развітанне Сяргея з Бурыкам і нечаканую апошнюю сустрэчу з мядзведзем ў лесе восенню сорак другога года. Падрыхтаваць вусны аповед пра жыццё Бурыка ў сям'і Сяргея | Адказаць на вызначаныя настаўнікам пытанні да твора, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Прыгадаць смешныя здарэнні, што адбыліся з Бурыкам, і распавесці пра іх |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 63 | | 1 | Замацаваць і паглыбіць веды вучняў пра літаратурнага героя і спосабы яго паказу ў празаічным творы (думкі, перажыванні, учынкі, стасункі з другімі героямі, партрэт, пейзаж, інтэр'ер, мова, мастацкая дэталь, адносіны аўтара) | Чытанне і абмеркаванне тэарэтычнага артыкула вучэбнага дапаможніка «Пра літаратурнага героя». Узнаўленне эпізодаў, важных для характарыстыкі аўтара-апавядальніка Сяргея | Перачытаць артыкул «Пра літаратурнага героя». Падрыхтаваць вусную характарыстыку-Сяргея, карыстаючыся інфармацыяй тэарэтычнага артыкула і ведамі, атрыманымі на ўроку |
| 64 | **Урок развіцця маўлення** Разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя (па адным з папярэдне вывучаных твораў) | 1 | Падагульніць веды вучняў пра літаратурнага героя і спосабы яго абмалёўкі ў мастацкім творы. Высветліць адносіны вучняў да абранага літаратурнага персанажа, іх уменні вылучаць галоўнае ў яго паводзінах, даваць ацэнку герою ў адпаведнасці з яго ўчынкамі і перажываннямі, рыхтаваць разгорнуты адказ на пастаўленае пытанне | Падрыхтоўка разгорнутага адказу на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя. Прыкладныя пытанні: «Заўчаснае сталенне Міколкі» (Міхась Лынькоў. «Васількі»); «Дружба Сяргея з Бурыкам» (Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»); «Дзік — адданы і надзейны сябар» (Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік» | Падрыхтаваць вуснае сачыненне «Мой дамашні сябар» (пра сваю хатнюю жывёліну) |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | **VI. Прыгоды і падарожжы (4 гадзіны)** | | |
| 65 | Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» | 4 | Зацікавіць пяцікласнікаў прыгодніцкай аповесцю Міхася Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Прааналізаваць раздзелы: «Пра Мішкава дзяцінства і аб тым, як ён маліну любіў», «Пра Вясёлую Бараду і пра чорнага Жука». Звярнуць увагу вучняў на займальнасць дзеяння ў творы, на пейзажныя апісанні, аўтарскую характарыстыку персанажаў | Самастойнае чытанне вызначанай настаўнікам часткі твора. Падрабязны аналіз падзей, адлюстраваных у аповесці-казцы. Гутарка па пытаннях, прапанаваных настаўнікам для абмеркавання. Складанне плана, пераказ асобных эпізодаў. Аналіз карцін прыроды і іх ролі ў расцкрыцці мастацкай ідэі твора | Перачытаць акрэсленыя раздзелы аповесці Міхася Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Падрыхтаваць сціслае вуснае паведамленне пра Мішкава дзяцінства, яго гульні і забаўкі |
| 66 | | | Засяродзіць увагу вучняў на разглядзе раздзелаў: "Як Мішка трапіў на вайсковую службу», «Дзіўны хворы». Удасканальваць навыкі вучняў выразна чытаць празаічны тэкст займальнага зместу, вучыць перадаваць пры чытанні стоены аўтарскі гумар, аўтарскую сімпатыю, добразычлівае стаўленне да герояў | Выразнае чытанне акрэсленых раздзелаў, пераказ эпізодаў, важных для характарыстыкі галоўнага героя. Абмеркаванне аўтарскага стаўлення да герояў і падзей (з цытаваннем тэксту) | Перачытаць акрэсленыя настаўнікам раздзелы твора. адказаць на пытанні. Вывучыць на памяць вызначаны настаўнікам урывак тэксту |
| 67 | | | Прааналізаваць вучнёўскае чытанне на памяць урыўка прозы. Арганізаваць разгляд наступных раздзелаў: («Як Мішку скралі і што з таго выйшла», «Мішка-герой»). Разгледзець жанравыя адметнасці прыгодніцкай аповесці-казкі | Разгляд акрэсленых эпізодаў, пераказ прыгодаў, у якія трапілі персанажы твора. Выразнае чытанне на памяць вызначанага настаўнікам ўрыўку тэксту і яго калектыўнае абмеркаванне | Дачытаць аповесць, адказаць на пытанні да ўсяго твора |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 68 | | | Абагульніць ўражанні вучняў ад усёй аповесці, прыгадаць камічныя сітуацыі і эпізоды, што лепш запомніліся, падсумаваць назіранні за героямі твора.<br>Адзначыць жанравыя адметнасці прыгодніцкай аповесці-казкі | Аналіз фіналу аповесці. Вуснае разважанне пра магчымыя далейшыя лёсы герояў, іх жыццёвыя пуцявіны пасля заканчэння вайны. Разгляд жанравых уласцівасцей прыгодніцкай аповесці-казкі (са спасылкай на мастацкі тэкст) | Падрыхтаваць вусную замалёўку «Жыццё Мішкі (або Барадатага ці Жука) пасля заканчэння вайны |
| 69 | **Урок дадатковага чытання** | 1 | Урок па творы, прапанаваным праграмай для дадатковага чытання (на выбар настаўніка) | | |
| 70 | Паўтарэнне і абагульненне вывучанага за год | 1 | Падвесці вынікі навучальнага года, высветліць уражанні вучняў ад курса літаратуры, акрэсліць будучыя перспектывы, даць парады для чытання ўлетку. Настаўнік выбірае форму правядзення ўрока (найлепш займальную — конкурс, КВЗ і інш. Варта загадзя настроіць вучняў на чаканне свята і далучыць пяцікласнікаў да яго падрыхтоўкі) | Удзел у падрыхтоўцы заключнага ўроку (з улікам прапаноў настаўніка і асабістай ініцыятывы кожнага вучня) | Пазнаёміць вучняў са спісам мастацкіх твораў, рэкамендаваных для дадатковага чытанне ўлетку |

© НМУ «Национальный институт образования», 2015
© ОДО «Аверсэв», 2015